# Голас Радзімы

№ 38 (2180)
20 верасня 1990 г.

ГАЗЕТА БЕЛАРУСКАГА ТАВАРЫСТВА ПА КУЛЬТУРНЫХ СУВЯЗЯХ З СУАЙЧЫННІКАМІ ЗА РУБЯЖОМ
(БЕЛАРУСКАЕ ТАВАРЫСТВА «РАДЗІМА»)

Выдаецца з 1955 г.
Цана 4 кап.


Францыск Скарына 500

Юбілей Францыска Скарыны стаў вялікім усенародным святам у Беларусі. Урачыстасці, якія пачаліся ў Мінску, прадоўжыліся на радзіме нашага славутага земляка—у Полацку. На свята да нас прыехалі госці з Канады, Англіі, Польшчы, Балгарыі, Чэхаславакіі, ФРГ, Італіі, Югаславіі, з усіх саюзных рэспублік. Але рамкамі Мінска і Полацка свята не абмежавалася. Юбілей адзначала ўся рэспубліка. У гарадах і пасёлках прайшлі фестывалі народнай творчасці, мастацкія выстаўкі і выстаўкі кніг, сустрэчы з пісьменнікамі і артыстамі.

Неўзабаве адбудзецца ўрачыстасць і ў Парыжы, у штаб-кватэры ЮНЕСКА. Туды адправіцца афіцыйная дэлегацыя, выступіць ансамбль народнай музыкі «Жывіца», будзе дэманстравацца выстаўка «Скарына і яго эпоха», выстаўка скарынінскіх кніг і выданняў пра яго. Завершыцца святкаванне 500-годдзя з дня нараджэння вялікага сына Беларусі на Генеральнай Асамблеі ААН у Нью-Йорку.

(Чытайце на 6-й старонцы матэрыял пра ўрачыстасці, што адбыліся ў Полацку).









ЗГУРТАВАННЕ БЕЛАРУСАЎ

## «БАЦЬКАЎШЧЫНА»

Адбылася ўстаноўчая канферэнцыя згуртавання беларусаў свету «Бацькаўшчына». У ёй прынялі ўдзел не толькі беларусы з самой Беларусі, а і з рэспублік СССР Літвы, Латвіі, Эстоніі, Расіі, Украіны, прыехалі суайчыннікі з Англіі, Канады, Польшчы.

Устаноўчая канферэнцыя прыняла статут згуртавання «Бацькаўшчына». Старшынёй рады быў выбраны народны пісьменнік Беларусі Васіль Быкаў. Аднак арганізацыйная работа яшчэ не завершана. Справа ў тым, што «Бацькаўшчына» можа сапраўды лічыцца таварыствам беларусаў з усяго свету толькі пасля правядзення кангрэса, у якім прынялі б удзел прадстаўнікі ўсёй беларускай дыяспары.

Фундатарамі-заснавальнікамі «Бацькаўшчыны» выступілі АН БССР, БДУ імя У. І. Леніна, Беларускі фонд культуры, Саюз пісьменнікаў БССР, газета «Літаратура і мастацтва», Саюз кааператараў Беларусі, вытворчае аб'яднанне «БелаўтаМАЗ» і іншыя — усяго 15 установ, аб'яднанняў і арганізацый.

ПРАЦАЎЛАДКАВАННЕ

## «КІРМАШ ВАКАНСІЙ»

«Кірмаш вакансій», упершыню праведзены ў Мінску, некаторыя журналісты паспяшаліся назваць біржай. Але ж апошняя павінна мець, як мінімум, наяўнасць «рынку» рабочых рук — іх лішак. Мяркуючы па колькасці прысутных у Доме культуры чыгуначнікаў работадаўцаў — ад аэрапорта Мінск-2 да медыцынскіх устаноў — сітуацыя цяпер адваротная. Колькасць вакансій у больш чым паўтарамільённым горадзе складае 19 тысяч. Словам, пакуль што «прадаюцца» не рабочыя рукі, а месцы.

Але калі попыт на класных рабочых яшчэ вялікі, то інжынерам і кіраўнікам рознага ўзроўню ўжо цяпер знайсці месца няпроста. Колькасць незанятых у рэспубліцы перавышае колькасць вакансій на 27 тысяч. Строга кажучы, менавіта для стольких нашых землякоў работы проста няма.

Занятасцю цяпер распараджаецца Рэспубліканскі цэнтр па працаўладкаванню, перанавучанню і прафарыентацыі насельніцтва, куды і паступаюць даныя аб жадаючых знайсці работу. Але даныя гэтыя даволі ўмоўныя: далёка не ўсе часова не працуючыя паведамляюць аб гэтым у цэнтр, лічачы за лепшае шукаць месца з дапамогай знаёмых. Ды і які сэнс рэгістравацца ў якасці беспрацоўнага, калі ніякіх сацыяльных гарантый чалавек у гэтым выпадку не атрымае. Больш таго — у краіне не вызначаны статус беспрацоўнага. Асновы заканадаўства Саюза ССР і саюзных рэспублік аб занятасці насельніцтва існуюць яшчэ толькі ў праекце. Але і гэты дакумент выкарыстоўвае абцякальную фармулёўку — «часова незаняты» работнік.

У бліжэйшы час, несумненна, становішча з занятасцю абвострыцца. Залежыць гэта будзе, у прыватнасці, ад варыянта пераходу да рынку, які прыме саюзны ўрад. Але нават па асцярожных падліках спецыялістаў, у 1991 годзе колькасць незанятых можа скласці амаль чвэрць мільёна чалавек.

ПРЫЗНАННЕ

## КАПЭЛЕ БІСІРУЮЦЬ ЗА МЯЖОЙ

З вялікім поспехам прайшлі першыя зарубежныя гастролі Дзяржаўнай акадэмічнай капэлы БССР імя Р. Шырмы. Нядаўна калектыў разам з галоўным аркестрам рэспублікі і Мінскім дзіцячым хорам вярнуўся з ФРГ, дзе ўдзельнічаў у двух міжнародных творчых фестывалях — «Каталонскае лета ў Гамбургу» і «Музычныя дні ў Кафедральным саборы горада Шпаера». Па заслугах ацаніўшы майстэрства нашых артыстаў, арганізатары гэтых канцэртаў запрасілі капэлу ў ФРГ і Іспанію для паўторнага выканання складанейшага твора «Чырвоная кніга» сучаснага каталонскага кампазітара Бенгерэля, а таксама славянскай духоўнай музыкі. Дасягнута папярэдняя дагаворанасць і з Міжнародным цэнтрам па культурных сувязях Мексікі аб паездцы ў гэту і іншыя краіны Лацінскай Амерыкі.

*«Напярэдадні напісання новай «Гісторыі Беларускай літаратуры» няўвага беларускіх савецкіх літаратуразнаўцаў да мастацкіх твораў пісьменнікаў-эмігрантаў пагражала б ранейшым падрывам прынцыпу навуковасці, вяла б да здрады дэмакратычным ідэалам перабудовы. А гэтага дапусціць нельга.*

*Так, сярод замежных беларускіх пісьменнікаў ёсць людзі са складанымі палітычнымі лёсамі, але гэта акалічнасць не павінна варожа адхіляць ад іх творчасці, якая таксама з'яўляецца часткай духоўнага жыцця беларускага народа. Акрамя таго, час пачаць улічваць, што зламанасць лёсаў многіх з іх адбылася далёка не заўсёды па іх уласнай волі. Творчасць эмігрантаў-пісьменнікаў безумоўна патрабуе аб'ектыўнага вывучэння, нескажонай ацэнкі. На фоне сучаснай замежнай беларускай літаратуры асабліва прыкметныя фігуры Н. Арсеньевай і М. Сяднёва. Не толькі па абавязку прафесійнага доўгу, але і па загаду сацыялістычных светапоглядных перакананняў, што прызнаюць прынцып сапраўднага гістарызму, мы павінны імкнуцца да аб'ектыўнай паўнаты ўзнаўлення ўсёй духоўнай спадчыны, якая маецца ў гістарычным распараджэнні беларускага народа».*

*(Віктар КАВАЛЕНКА,*
*дырэктар Інстытута*
*літаратуры АН БССР).*

ВЕСТКІ АДУСЮЛЬ

У Мінску выйшаў першы нумар часопіса «Унія». Выдае яго суполка грэка-католікаў, зарэгістраваная пры Таварыстве беларускай мовы. Апрача Мінска, суполка уніятаў узнікла і ў Гомелі.

І для кіраўнікоў, і для рабочых Шацкага механічнага завода, што ў Мінскай вобласці, адпачываць за мяжой — не навіна. 45 чалавек ужо пабывалі на курортах Балгарыі, і яшчэ 15 паедуць туды неўзабаве. Адпачываць за мяжой выпраўляюцца звычайна сем'ямі, пры гэтым палавіну кошту пуцёўкі аплачвае прадпрыемства.

Савет Міністраў Беларускай ССР прыняў пастанову «Аб увекавечанні памяці Яўгеніі Янішчыц». Паэтэсе, чыя творчасць саргавала сэрцы беларусаў і трывожыла іх думкі і якая так заўчасна адышла ад нас, на яе магіле будзе ўстаноўлены помнік. А Саюз пісьменнікаў і Дзяржаўны камітэт па друку выпусцяць збор твораў Я. Янішчыц.

У вёсцы Цырын Карэліцкага раёна адбудавана царква, якая была спалена ў час Вялікай Айчыннай вайны. За апошнія два гады на Гродзеншчыне веруючым вернута 68 храмаў, а яшчэ 9 будуюцца.

«Гэта — Італія», так назваў выстаўку сваіх работ, якая дэманструецца ў фае сталічнага кінатэатра «Кастрычнік», фотажурналіст Юрый Іваноў.

У экспазіцыі прадстаўлена каля 100 здымкаў, якія дазваляюць гледачам даведацца аб жыцці, быце жыхароў далёкай краіны, знаёмяць з цудоўнымі краявідамі Італіі.

СУДОВАЯ СПРАВА





**У ноч з 8 на 9 чэрвеня пасля сваркі з бацькам 17-гадовы студэнт Жодзінскага політэхнічнага тэхнікума Д. Сямёнаў, пагражаючы ўзарваць самалёт, які ляцеў па маршруту Мінск—Мурманск, прымусіў экіпаж змяніць курс і прызямліцца ў Стакгольме.**

**Д. Сямёнаў быў перададзены савецкім уладам па рашэнню шведскага ўрада. Экспертыза шведскіх псіхіятраў не выявіла ў Сямёнава ніякіх псіхічных адхіленняў. Не пацвярджаюцца і палітычныя матывы ўгону самалёта. Пяццю гадамі пазбаўлення волі ў калоніі агульнага рэжыму абярнуўся неабдуманы ўчынак 17-гадоваму студэнту Жодзінскага політэхнічнага тэхнікума Дзмітрыю Сямёнаву.**

**НА ЗДЫМКАХ: у зале суда; вось так хутка адправіцца асуджаны Д. СЯМЁНАЎ да месца пазбаўлення волі.**

НАТАТКІ КАМЕНТАТАРА

# НАДЗЕІ НА «ЦУД»

Здаецца, прэзідэнцкі Указ «Аб новых падыходах да вырашэння жыллёвай праблемы ў краіне...», прыняты ў маі гэтага года, чакае той жа лёс, што і ўрадавую пастанову аб продажы ў асабістую ўласнасць дамоў і кватэр, якія арандуюць савецкія людзі ў дзяржавы. Крыху больш чым праз год пасля апублікавання яго толькі нямногія выказалі жаданне стаць уласнікамі квадратных метраў, што належаць дзяржаве. У любым савецкім горадзе — Маскве ці Мінску або Ленінградзе, Брэсце такіх «ахвотнікаў» можна пералічыць па пальцах.

Зрэшты, з самага пачатку было ясна, што з распродажам у дзяржавы нічога не атрымаецца. Трэба вельмі дрэнна ведаць псіхалогію радавога савецкага кватэранаймальніка, каб разлічваць на яго зберажэнні ў справе, выгада ад якой зусім няясная. І сапраўды, які сэнс выкупляць тое, што і так яму належыць. Няхай не на правах асабістай уласнасці, а ўсяго толькі ў форме арэнды, але затое — якой. Вечнай, з правам наследавання, ды яшчэ да таго ж, калі мець на ўвазе аплату, вельмі выгаднай. Калі цяпер сям'я, якая арандуе ў дзяржавы жыллё, плаціць за яго прыкладна трэць таго, у што абыходзіцца дзяржаве яго ўтрыманне, то пасля выкупу ёй давялося б пакрыць усе расходы ў сувязі з гэтым ды яшчэ да таго ж аплачваць і капітальны рамонт.

Як бачым, прычыны, што выклікалі вельмі спакойныя адносіны савецкіх людзей да распродажу дзяржаўнага жылля, больш чым грунтоўныя.

Але пры чым тут Указ Прэзідэнта? А пры тым, што і ў ім, няхай фрагментарна, але ўсё ж прысутнічае надзея, што савецкія людзі яшчэ раз аплацяць тое, што імі ўжо даўно і, магчыма, неаднаразова аплачана. Бо калі разабрацца, то сродкі, што ўкладваюцца дзяржавай у жыллёвую праграму (прыкладна 35 мільярдаў рублёў), на ўтрыманне жылля (каля 11 мільярдаў), гэта — грошы, недаплачаныя савецкаму кватэранаймальніку за яго працу.

І ўсё ж, думаецца, што прэзідэнцкі Указ «буксуе» не столькі таму, што распродаж дзяржаўнага жылля не карыстаецца папулярнасцю ў народзе, колькі па іншых прычынах. Галоўная з іх заключаецца ў тым, што Указ «запушчаны ў вытворчасць» у крайне неспрыяльны і для прэзідэнцкай, і для выканаўчай улады час. У краіне, у яе эканоміцы, ранейшая каманднa-адміністрацыйная сістэма кіравання практычна выключылася з работы, а новая, заснаваная на эканамічных метадах, яшчэ не склалася.

Разам з тым, калі адысці ад славутага распродажу жылля, Указ змяшчае цэлы шэраг прынцыпова новых палажэнняў, такіх, як структурнае пераўтварэнне галіны, што абяцае прыярытэт у інвестыцыйным і матэрыяльна-тэхнічным забеспячэнні праграмам грамадзянскага будаўніцтва, і ў першую чаргу жыллёвай, як шырокае, без усялякіх абмежаванняў, прыцягненне да фінансавання жыллёвай праграмы свабодных сродкаў прадпрыемстваў і арганізацый, кааператываў, акцыянерных таварыстваў, асабістых зберажэнняў грамадзян пры максімальна магчымай падтрымцы з боку пазыковага фонду дзяржавы.

Заслугоўвае напамінку і праграма індывідуальнага жыллёвага будаўніцтва, што прадстаўлена ва Указе, якая, як вядома, раней не карысталася прыхільнасцю дзяржавы. З гэтага моманту яна становіцца адным з асноўных напрамкаў вырашэння жыллёвай праблемы ў краіне. Ва Указе гаворыцца: здзейсніць рэзкі паварот домабудаўнічай індустрыі да індывідуальнага жыллёвага будаўніцтва, зжыць негатыўныя адносіны да яго, пераадолець запушчанасць у гэтай справе, усяляк заахвочваць ініцыятыву кожнага, хто імкнецца пабудаваць свой дом. З гэтай мэтай у вёсках, гарадах і прыгарадах бесперашкодна адводзіць зямельныя ўчасткі з прадастаўленнем грамадзянам права валодання імі аж да перадачы ў спадчыну.

Прынцыпова важным момантам у практыцы вырашэння жыллёвай праблемы з'яўляецца і афіцыйна дазволены рынак жылля. У адпаведнасці з Указам, купіць ці прадаць жыллё можна будзе цяпер без удзелу дзяржавы, як пасрэдніка гандлёвага абмену, і па цане, якая складваецца ў выніку попыту і прапановы.

Прыцягвае і прадастаўленае Указам права абмену дзяржаўнага жылля на індывідуальнае, чаго раней не дапускалася. Засмучае перспектыва пераводу камунальнай службы савецкіх гарадоў на камерцыйную аснову, што, несумненна, абернецца падаражаннем як паслуг, так і кватэрнай платы.

Указ, канстатуючы крайне абвостраную патрэбу ў жыллі (чарга на паляпшэнне дасягнула 14 мільёнаў сямей, з якіх звыш 6 мільёнаў пражываюць у камунальных кватэрах, 4,5 мільёна — ва ўмовах, якія не адпавядаюць элементарным санітарным нормам), патрабуе падвоіць тэмпы жыллёвага будаўніцтва з такім разлікам, каб ужо ў 1991 годзе выйсці на ўзровень 155—160 мільёнаў квадратных метраў карыснай плошчы ў год (цяпер штогод будуецца ў сярэднім 127 мільёнаў квадратных метраў), а з 1995 года — 230—240 мільёнаў. Пры такім паскарэнні, робіцца вывад у прэзідэнцкім Указе, можна будзе рэальна разлічваць на забеспячэнне да 2000 года кожнай сям'і, уключаючы і адзінокіх, асобнай кватэрай ці домам.

Усё гэта добра, але нерэальна. Падобныя тэмпы не па сіле цяперашняй, цалкам разбалансаванай савецкай эканоміцы, разладжанаму жыллёваму комплексу. Хіба што цуд можа дапамагчы ўраду справіцца з гэтай задачай, якую ставіць перад ім прэзідэнцкі Указ. Асабіста я спадзяюся толькі на яго, гэта значыць на «цуд», маючы на ўвазе зусім не боскую ласку, дадзеную людзям у выглядзе манны нябеснай, а рынак і рыначныя адносіны, на якія савецкая эканоміка пераходзіць з першых дзён 1991 года. Калі ўсё адбудзецца так, як задумана, калі рыначныя адносіны запрацуюць, то праблема жылля ў краіне будзе, упэўнены, вырашана ў тыя тэрміны і на тым узроўні, якія прадпісвае прэзідэнцкі Указ.

**Аляксандр ДЗЕДУЛ.**

## МЕРКАВАННЕ ДЭПУТАТА

# ЦІ ДОЎГА ЯШЧЭ ЧАКАЦЬ?

*Народны дэпутат ад Беларусі ў савецкім парламенце, мінчанін, інжынер, член міжрэгіянальнай дэпутацкай групы А. Дабравольскі рэгулярна сустракаецца са сваімі выбаршчыкамі. На адной з такіх сустрэч пабываў журналіст Міхась СТЭЛЬМАК. Ён прапануе своеасаблівую справаздачу той гутаркі. На пытанні адказвае Аляксандр ДАБРАВОЛЬСКІ.*

**— Вышэйшым органам улады краіны з'яўляецца З'езд народных дэпутатаў СССР. Аднак у грамадскай думцы спеюць пераканані аб яго немэтазгоднасці. Ці падзяляеце вы іх?**

— Падзяляю. Прайшоўшыя тры з'езды засведчылі поўную бесперспектыўнасць такога органа. З майго пункту гледжання, пасяджэнні двухтысячнага дэпутацкага корпуса недзеяздольныя для належнага абмеркавання і прыняцця важных рашэнняў. Узяць хаця б пытанне аб прэзідэнцтве ў СССР. Яно было вырашана так, як хацелася апарату, некаторым прадстаўнікам вышэйшага кіраўніцтва краіны. Многія народныя дэпутаты ад Беларусі мелі іншыя думкі па гэтаму пытанню, аб чым і было даручана выказацца мне ад іх імя на 3-м З'ездзе. У агульным спісе выступаючых я ішоў дваццаць другім. Нумарам сто другім быў пазначаны ў спісе Старшыня Вярхоўнага Савета БССР М. Дземянцей. У выніку апошняму прадаставілі слова, мяне ж, невядома па якіх прычынах, выкраслілі са спісу. У сувязі з гэтым ад вялікай групы беларускіх дэпутатаў, у склад якіх уваходзіў і цяперашні першы намеснік кіраўніка рэспубліканскага парламента С. Шушкевіч, была падрыхтавана заява-пратэст, уручаная мной асабіста Міхаілу Гарбачову.

**— Што, па-вашаму, уяўляе сабой вядомая дэпутацкая група «Саюз»?**

— Ад ініцыятараў стварэння гэтай групы кожны народны дэпутат СССР атрымаў прапанову ўступіць у яе. У тым ліку і я. Група адстойвае федэратыўны прынцып пабудовы Савецкай дзяржавы. Аднак цэласнай канцэпцыі свайго бачання існавання СССР у перспектыве яна пакуль што, лічу, не прадставіла. А вось другая дэпутацкая група, міжрэгіянальная, у якую ўваходжу і я, актыўна займаецца распрацоўкай праекта новага дагавора паміж цяперашнімі саюзнымі рэспублікамі.

**— Чым асабіста вы займаецеся ў вышэйшым органе ўлады краіны?**

— Я член Камісіі Вярхоўнага Савета СССР па пытаннях развіцця прамысловасці, энергетыкі і тэхналогіі. У яе складзе ўдзельнічаў у распрацоўцы многіх законапраектаў, якія затым былі адобраны парламентам краіны. У прыватнасці, гэта датычыцца і такіх шырока вядомых сёння законаў аб зямлі і ўласнасці. Як член рабочай групы названай камісіі, зараз актыўна займаюся стварэннем праекта закона аб абароне правоў спажыўцоў.

**— Ці можна сказаць, што ўлада ў СССР ужо сёння належыць Саветам?**

— Мне здаецца, не. Яна зараз толькі паволі перацякае да іх ад КПСС і выканаўчых органаў. На ўсіх узроўнях. У тым ліку і на самым верхнім. Пра тое, што народныя дэпутаты краіны не ўсё яшчэ і зараз вырашаюць, сведчыць, па-мойму, хаця б такі прыклад. Прэзідэнцкі савет і Саўмін краіны прынялі нядаўна рашэнне аб пераводзе савецкай эканомікі на рыначныя адносіны. Правільнае, трэба сказаць, рашэнне. Але ж я, як прадстаўнік народа ў вышэйшым органе ўлады краіны, ніякіх афіцыйных дакументаў на гэты конт не атрымліваў. Выходзіць, што вышэй названымі органамі проста ігнаруецца дэпутацкая думка.

**— Акрамя заканадаўчай працы ў вышэйшым органе ўлады краіны ў кола абавязкаў народнага дэпутата СССР уваходзіць і дзейнасць у выбарчай акрузе. Што вам удалося зрабіць тут?**

— Прайшоў год з невялікім з дня абрання мяне народным дэпутатам жыхарамі Ленінскага, Кастрычніцкага і Цэнтральнага раёнаў беларускай сталіцы. У акрузе, якую я прадстаўляю ў Маскве, пражывае каля 300 тысяч чалавек. За гэты час праведзена з імі каля 70 сустрэч, атрымана на разгляд амаль пяцьсот зваротаў грамадзян. У асноўным — скаргі. Шчыра кажучы, такога іх патоку я не чакаў. Вядома, далёка не ўсім сваім выбаршчыкам у сілу аб'ектыўных прычын, у першую чаргу, эканамічных, мне ўдалося дапамагчы. Але я разлічваю на станоўчыя зрухі ў гэтым пытанні ўжо ў бліжэйшы час.

**— Якой вы думкі пра новы Вярхоўны Савет БССР?**

— Я добра быў знаёмы з беларускім парламентам мінулага склікання. Прымаў удзел у рабоце практычна ўсіх яго апошніх сесій. Яго дэпутацкі корпус мог бы прыняць, па майму цвёрдаму перакананню, любы закон, які б яму ні прапанавалі. Абсалютная большасць парламентарыяў таго саставу не адпавядала свайму высокаму званню. Адны з-за таго, што глядзелі ў рот кіраўніцтву і не мелі ўласнай думкі. Другія з-за таго, што былі абсалютна не падрыхтаваны да працы ў парламенце.

Што датычыцца цяперашняга Вярхоўнага Савета. Пакуль ён цяжка прадказуемы ў сваіх дзеяннях. І ўсё ж выбранне другой асобай у парламенце прадстаўніка дэмакратычнага блока — С. Шушкевіча абнадзейвае, што ён спраўдзіць чаканні многіх грамадзян рэспублікі, якія жадаюць перамен.

## СУЧАСНАЯ ГАСПАДАРКА



**Толькі нядаўна многія нашы прадпрыемствы і арганізацыі сталі працаваць ва ўмовах самаакупнасці і самафінансавання. У калгасе «XVII партз'езд», што на Магілёўшчыне, першыя элементы гаспадарчага разліку пачалі ўкараняцца каля 30 гадоў назад, калі гаспадарку ўзначаліў Іван Мельнік. Тады старшыні неабходна было знайсці механізм, які б дазволіў узняць прадукцыйнасць працы, прымусіў бы людзей працаваць сумленна, па-гаспадарску ставіцца да калгаснага дабра. І пачаў Іван Ігнатавіч з ліквідацыі ўраўнілаўкі ў аплаце працы, з умацавання дысцыпліны. Не адзін год спатрэбіўся Івану Мельніку, цяпер Герою Сацыялістычнай Працы, каб даказаць правільнасць сваіх дзеянняў. Сёння «XVII партз'езд» — адна з буйнейшых гаспадарак не толькі Магілёўшчыны, але і рэспублікі. У мінулым годзе калгас прадаў дзяржаве сельскагаспадарчай прадукцыі больш чым на 13,5 мільёна рублёў. Прадукцыйнасць працы тут — адна з самых высокіх сярод гаспадарак Беларусі. У «XVII партз'ездзе» вырашылі так: ніводная галіна не павінна быць стратнай. Ужо даўно акупіў сябе свінагадоўчы комплекс на 12 000 галоў, які дае сёння з кожнага рубля затрат 76 капеек прыбытку. З лісіных, норкавых і пясцовых шкурак, што паступаюць з калгаснай зверафермы, майстры швейнага цэха шыюць такія шапкі і паўкажушкі, якія наўрад ці залежаліся б на прылаўках любога магазіна. Ад іх продажу гаспадарка штогод атрымлівае каля мільёна рублёў.**

**НА ЗДЫМКАХ: агульны выгляд цэнтральнай сядзібы—Аўсянкі; старшыня калгаса «XVII партз'езд» Герой Сацыялістычнай Працы Іван МЕЛЬНІК; адзін з вырабаў швейнага цэха калгаса дэманструе кушнер-раскройшчык Таццяна ІВАНОВА**

**Фота У. ВІТЧАНКІ і С. ЖАЛУДОВІЧА.**





## «ХТО ЁСЦЬ ХТО Ў СУСВЕТНАЙ ПАЛІТЫЦЫ»

# ЗВЫШ 1500 САМЫХ ПАПУЛЯРНЫХ ІМЁНАЎ

Ці ведаеце вы, што Міхаіл Гарбачоў нарадзіўся ў сялянскай сям'і і сваю працоўную дзейнасць пачаў у 15 гадоў механізатарам машынна-трактарнай станцыі? Што ён мае дзве вышэйшыя адукацыі — сельскагаспадарчую і юрыдычную? Што Раіса Гарбачова 20 гадоў выкладала ў вышэйшых навучальных установах і абараніла дысертацыю на вучоную ступень кандыдата (па заходніх мерках—доктара) філасофскіх навук? Што дачка Гарбачовых Ірына і яе муж Анатоль — медыкі, бацькі дваіх дзяцей?

Гэтыя і іншыя звесткі пра Міхаіла Гарбачова і яго блізкіх змяшчае ў ліку іншых звестак даведнік «Хто ёсць хто ў сусветнай палітыцы», які будзе выпушчаны праз некалькі месяцаў на рускай мове ў Маскве. У кнізе — больш за 1 500 персаналій, прысвечаных нашым сучаснікам, пра каго асабліва часта пішуць і гавораць ва ўсіх краінах планеты.

Гутарка ідзе аб больш ці менш вядомых дзяржаўных, грамадскіх, рэлігійных дзеячах, якія пакінулі прыкметны след у сферы міжнародных адносін. Але нават самыя вядомыя людзі аказваюцца для нас нярэдка «знаёмымі незнаёмцамі»: як бы многа мы ні чулі ці чыталі пра іх, усё роўна маглі нешта ўпусціць ці забыць, а ў нечым атрымаць і няпоўную інфармацыю. Удакладніць, папоўніць ці асвяжыць у памяці патрэбныя нам падрабязнасці чыёйсці біяграфіі дапаможа новая галерэя партрэтаў «Хто ёсць хто...»

У дні нядаўняй савецка-амерыканскай сустрэчы ў вярхах Джордж Буш у адным са сваіх выступленняў абыграў назву сяла, дзе нарадзіўся М. С. Гарбачоў,— Прывольнае. Перадаўшы па-англійску значэнне гэтага слова як «прасторнае», «свабоднае», прэзідэнт ЗША дадаў, што яно асацыіруецца цяпер з новымі вятрамі свабоды, якія веюць над Еўропай і ўсёй Зямлёй. Але калі б журналісты захацелі праверыць напісанне рускага тапоніма, якое ўпамянуў Дж. Буш, па Вялікай Савецкай Энцыклапедыі (ВСЭ) апошняга выдання, то дарэмна б пачалі шукаць артыкул пра Гарбачова ў томе 7 («Гогаль — дэбіт»), што выйшаў у 1972 годзе.

Толькі ў 30-м томе ВСЭ (1978 год) — у раздзеле «Дапаўненні» ёсць кароткая даведка пра савецкага кіраўніка. У ёй паведамляецца, што М. С. Гарбачоў нарадзіўся 2 сакавіка 1931 года ў сяле Прывольнае Краснагвардзейскага раёна Стаўрапольскага краю (Паўночны Каўказ). У 1946—1950 гадах быў памочнікам камбайнера. У 1955-м скончыў Маскоўскі універсітэт (юрыдычны факультэт), у 1967-м — Стаўрапольскі сельскагаспадарчы інстытут. З 1956 года — на адказных пасадах у ВЛКСМ, з 1966-га — у КПСС, з 1971-га — член ЦК КПСС, з 1978-га — сакратар ЦК КПСС.

У ВСЭ адзначаецца, што М. С. Гарбачоў — выхадзец з сялян. Але не сказана, што яго бацька 40 гадоў прапрацаваў сельскім механізатарам, у гады другой сусветнай вайны быў сапёрам, цяжка паранены на фронце. Што маці Міхаіла — таксама калгасніца. Няма ні радка пра яго жонку, дачку...

Скупыя і старыя звесткі ВСЭ яўна не здольны задаволіць вялікую цікавасць міжнароднай грамадскасці да фігуры савецкага лідэра. Папоўніць гэтыя і падобныя прабелы дазволіць аднатомнік «Хто ёсць хто ў сусветнай палітыцы». Напрыклад, менавіта ён будзе першым у СССР даведнікам, дзе ёсць артыкул пра цяперашняга амерыканскага прэзідэнта. З яго мы даведаемся, што Джордж Буш — патомак багатых амерыканскіх буржуа. Яго маці—наследніца нью-йоркскіх банкіраў Уокераў. Бацька быў партнёрам нью-йоркскай фінансавай фірмы, пазней — сенатарам. Джордж Буш, які нарадзіўся 12 чэрвеня 1924 года ў Мілтане (штат Масачусетс), атрымаў адукацыю эканаміста ў Іельскім універсітэце. Ажаніўся з дачкой кіраўніка выдавецкай карпарацыі «Макол» Барбарай Рыпс. У 50—60-х гадах займаўся нафтавым бізнесам, з 1966-га — толькі палітыкай. Быў кангрэсменам, пастаянным прадстаўніком ЗША пры ААН, кіраўніком амерыканскай місіі сувязі ў Пекіне, дырэктарам ЦРУ і г. д.

Пільную ўвагу мільёнаў людзей на Захадзе і на Усходзе прыцягнуў да сябе новы патрыярх Маскоўскі і ўсяе Русі Алексій ІІ (свецкае імя Аляксей Рыдзігер), выбраны на прастол Рускай праваслаўнай царквы 7 чэрвеня 1990 года. Жыццяпіс яе чарговага першаіерарха з'явіцца рана ці позна ў самых розных энцыклапедыях, бібліяграфічных слоўніках і да т. п. Але аўтарам і рэдактарам гэтых выданняў і проста нецярплівым чытачам ён патрэбен не праз гады, а сёння-заўтра.

Вось невялікая даведка пра Алексія. Нарадзіўся 23 лютага 1929 года ў Таліне, сталіцы Эстоніі. У 1949 годзе скончыў сярэднюю школу, у 1953-м — духоўную акадэмію. У пачатку 50-х гадоў быў пра-

(Заканчэнне на 4-й стар.)

# DE LA BIOGRAFIA DE SKORINA

*La Editorial moscovita "Molodaia gvardia" (La joven guardia), en la popular serie de libros "La vida de personas destacadas", publicó la biografía de Francisco Skorina, una novela-ensayo del escritor Oleg LOIKO, miembro correspondiente de la Academia de Ciencias de Bielorrusia.*

—La mayoría de los libros de esta serie son biografías científicas de destacadas personalidades —señaló de entrada Oleg Loiko a nuestro reportero—. Pero en lo que respecta a Skorina, resulta imposible escribir una obra semejante, ya que conocemos tan sólo 44 hechos documentales de su biografía. Así que mi novela es un relato literario acerca de acontecimientos verídicos y posibles en la vida de nuestro glorioso compatriota. Describo a Skorina y las personas que lo rodeaban, la época en que le tocó vivir.

**—Muchos prosistas, poetas y dramaturgos bielorrusos se han referido en sus obras a la personalidad de Skorina y su época. Ahora usted es primero quien ha escrito una novela sobre él. Dígame, ¿cómo le surgió esta idea, y si está satisfecho con la obra?**

—Bueno, si se tiene en cuenta la escasez de documentos concernientes a la vida de Skorina, claro está que escribir una obra de este tipo resultó ser una tarea sumamente difícil y arriesgada. Este pensamiento me acompañó en todo momento, en especial después de escribir y publicar (a propósito, en la misma serie) mi libro sobre Yanka Kupala, nuestro poeta más famoso. Pero Kupala vivió en el siglo XX, mientras que Skorina, 500 años atrás. A mi modo de ver, nuestro mejor escrito sobre Skorina es un pequeño verso de Maxim Bogdanóvich, del ciclo "La Vieja Bielorrusia", el cual data del año 1912. Bogdanóvich fue uno de los primeros escritores bielorrusos que desarrolló en la literatura el tema de Skorina.

Resumiendo, durante largo tiempo no me atreví a comenzar mi obra, hasta que un día encontré los personajes para contraponer con Francisco. Así es como en mi novela aparecieron el doctor Johann Faust, contemporáneo de Skorina; el polaco Twardowski, personaje legendario de la balada de Adan Michkiewicz; el inmortal Golem, protagonista del folklore hebreo de la Praga medieval; Stanislaw Stanczik, payaso de la corte, etc. Pero, si yo tuviera que escribir este libro ahora, describiría a Skorina sobre un fondo algo diferente, en otras circunstancias y en compañía de otra gente.

**—¿A quiénes se refiere concretamente?**

—A personas que ocupaban los más altos cargos en aquella época. Ya que Skorina, debido a su actividad editora y de otro tipo, se contactaba con la aristocracia. Tenía amistad con siete monarcas europeos (según documentos que se conservan hoy día), quienes eran sus protectores. Entre ellos figuraban Luis II, rey de Hungría y Bohemia; el gran duque del Gran Principado Lituano y rey de Polonia Segismundo I, el Grande, quien jugó un destacado papel en la vida de Skorina (le concedía salvaconductos); el primer duque de Prusia, Albrecht, quien solicitaba ayudar al "famoso y sabio hombre", y el rey Ferdinando I, de Bohemia (precisamente en Praga Skorina pasó los últimos años de su vida). Todos ellos recibían con gusto a Skorina, por quien sentían un gran respeto. Cabe señalar que Skorina no era de origen aristocrático, sino que había nacido en el seno de una familia de comerciantes, por lo cual debía usar botas negras y caftán azul. No obstante, Skorina vestía la toga de doctor y boina roja, ambas prendas de la élite. Actualmente junto con el escritor Alexéi Petrashkévich esperamos encontrar un director de cine que esté dispuesto a filmar una película sobre la vida de Skorina.

Me parece que los bielorrusos todavía no hemos valorado en real dimensión lo que Skorina ha hecho por todos nosotros. Destacamos en primer lugar el hecho de que Skorina haya sido el primer impresor bielorruso. Pero no tenemos siempre presente que el primer libro fue impreso en el idioma de su pueblo. Como es sabido, el idioma es la base de la cultura de todo pueblo. Skorina fue el primero en considerarse parte de su pueblo, portador de su idioma natal e hijo de su tierra. Hizo todo lo posible para que los demás también lo comprendieran. Skorina mostró a sus compatriotas la tierra donde habían nacido y les dijo: "Ama tu tierra; aquí están tus raíces, tu origen; aquí viven personas que hablan tu mismo idioma, tus hermanos".

**Anotó Piotr PONKRATOVICH**



*Arturo Saquetti — conocido organista del Vaticano — por primera vez visitó la ciudad de Minsk, siendo invitado por la Sociedad de Músicos de la R.S.S. de Bielorrusia. Durante una semana en los marcos de los festejos del 500 aniversario del natalicio de Francisco Skorina, A. Saquetti impartirá clases de maestría musical en la interpretación al clavecín. Asimismo dará dos recitales.*
*En la foto: A. Saquetti (a la derecha) escucha una pieza musical que le interpreta Eugenio Filin-Yúrkov, estudiante del cuarto grado del Conservatorio de Lvov.*
*Foto: V. ALESHKEVICH*

## *LA UNESCO Y CHERNOBIL*

— La representación permanente soviética, junto con la secretaría de la UNESCO organizó la participación en el maratón televisivo "Chernóbil" de Mireille Mathieu, Enrico Macias, Marina Vlady, Salvatore Adamo, los cantantes italianos Anna Rusticano y Antonio Ranieri, Manu Dibango de Camerún, así como la cantante norteamericana Bárbara Hendricks —dijo a nuestro corresponsal **Vladímir LOMEIKO**, embajador permanente de la URSS ante la UNESCO—. Todos transfieren al fondo de Chernóbil sus honorarios por las actuaciones. Participan además en el maratón varios científicos de renombre mundial, como el profesor francés Pierre Pellerin, primer especialista en protección radiactiva, quien obsequió a Bielorrusia un equipo especial para el diagnóstico radiactivo por un valor de 450 mil francos.

Dicho sea de paso, cuando se habló sobre el traslado gratis de estos participantes a Moscú, los representantes de "Aeroflot" dijeron que para ello se necesita una autorización especial. Por cuanto el tiempo apremia, llamé al agente de "Lüfthansa" en Francfort, quien de inmediato aceptó transportar a siete personas a costa de su compañía.

El desarrollo de un gran proyecto "UNESCO y Chernóbil" es otra esfera en la que trabaja un grupo de especialistas extranjeros y soviéticos en esta organización, encabezado por B. Lefévre. Este programa único y de largo alcance busca atraer especialistas mundiales altamente competentes para estudiar las consecuencias de la avería de Chernóbil y elaborar medidas eficaces de ayuda a sus víctimas. La eficiencia de este programa será directamente proporcional al espíritu de la transparencia y cooperación en nuestros departamentos. Y ahí es precisamente donde nacen muchas dudas en Lefévre y sus colegas, cuando topan con la terca resistencia de nuestros burócratas.

# MAYOR FIABILIDAD DEL REACTOR

¿CÓMO hacer más segura la energética nuclear? En eso piensan hoy los científicos de energía nuclear y los proyectantes de centrales atómicas.

Parece que la "ligereza con que se conquistó el átomo" hizo adormecer la vigilancia. Frecuentemente al proyectar centrales atómicas no se vio ni teóricamente la posibilidad de un accidente en el reactor. Lo más horrible que se admitía, y además en unas circunstancias extraordinarias, era la ruptura de la tubería del primer contorno en todo su diámetro; pero eso sería un pequeño accidente en camparación con lo que ocurrió en Chernóbil.

De todas formas había especialistas que no excluían el peligro, viéndolo fundamentalmente en que en la zona activa del reactor en acción se concentraba una gran cantidad de combustible. Por eso, mucho antes del accidente, iniciaron labores cuya importancia se ha hecho evidente solamente en los días presentes.

Los científicos del Instituto de Energía Nuclear de la Academia de Ciencias de Bielorrusia supieron reconciliar dos principios más importantes en la técnica: la alta potencia y la máxima seguridad, al proyectar un reactor nuclear de bolas, instalación energética de nueva generación. Las barras de materiales radiactivos, que se utilizaron tradicionalmente en las centrales atómicas, fueron sustituidas por pequeñas bolas de combustible nuclear metidas en una envoltura protectora. Una vez en el reactor, las bolas aumentan en varias veces la superficie de irradiación del calor, por lo cual asciende verticalmente la capacidad del reactor. Gracias a ello, en la zona activa del reactor de bolas hay decenas de veces menos combustible nuclear que en las instalaciones nucleares tradicionales, lo cual disminuye sustancialmente las consecuencias de un posible accidente, incluso, muy serio. El combustible fresco se suministrará al reactor por pequeñas porciones dentro de unas cuantas semanas, y no una vez al año, como antes. Además, el carácter movedizo del combustible permitirá utilizar el transporte neumático para llevarlo al "fogón" y para sacarlo de allí.

Quedará resuelto también otro problema. Para trasladar los grandes barros de uranio, cumpliendo además todos los reglamentos de seguridad, hoy se necesitan enormes contenedores de plomo. Pero por no existir mecanismos y vehículos adecuados que lo resistan, se fabrican contenedores "aligerados", y de ahí las consecuencias. En tanto que las bolas solucionan el problema muy fácilmente: primero se hace el contenedor adecuado por su peso y que garantice la plena seguridad radiactiva, y luego se echa en él tanta cantidad de combustible radiactivo cuanta se pueda trasladar sin peligro de irradiar el entorno.

—La idea de un reactor de bolas surgió en los años 50, pero problemas de carácter técnico obligaron a la energética nuclear mundial a emprender otro camino de desarrollo —dice el dirigente del proyecto y director del instituto, Vladimir Sorokin—. Nosotros sugerimos seguir buscando la salida. Hoy los problemas teóricos y técnicos fundamentales, relacionados principalmente con el enfriamiento de la zona activa, ya están resueltos. En el proyecto han encontrado aplicación más de un centenar de inventos, grandes descubrimientos fundamentales en el campo de la hidrodinámica y la termodinámica. Baste señalar que en las investigaciones de las particularidades del movimiento de los líquidos en el canal, se reveló un error en una fórmula física que se había utilizado en todo el mundo durante décadas para hacer cálculos en esta materia, un error al que se debían en buena medida los fracasos de los primeros intentos de crear un artefacto de este tipo.

La labor de todos los componentes del reactor nuclear de bolas fue comprobada en la computadora, se han hecho muchos experimentos con varios modelos. Ahora falta construir un modelo activo. También los científicos de Occidente realizan estudios en este importante campo.

**Dmitri PATIKO**

# TROSHIN EN EL PAPEL DE GORBACHOV

**Vladímir Troshin (64 años) es el primer actor soviético que interpretó el papel de Mijaíl Gorbachov.**

En un episodio de 10 minutos en la película "Ultima advertencia" del director norteamericano Tony Page, Troshin en el papel de presidente del país recibe en su despacho a Armand Hammer y al doctor Gale. La película es una versión cinematográfica del libro de Robert Gale, que lleva el mismo título y está dedicada a la avería en la CEN de Chernóbil. Allí actuó Jon Voight, una de las estrellas del cine norteamericano, cuyos honorarios ascendieron a 3 millones de dólares (mientras que Troshin recibió por un día de filmación unos 250 rublos). Troshin fue invitado a la película por Galina Bábicheva, la segunda directora del filme.

— Vladímir Troshin trabajó toda su vida en el Teatro de Arte —cuenta ella—. En tiempos pasados interpretó el papel de Lenin en el espectáculo "El carillón del Kremlin". Además de él, había otro candidato para el papel de Gorbachov. Pero los norteamericanos prefirieron a Troshin, a pesar de que el otro candidato se parecía más al presidente. Troshin pasó la prueba, para lo cual tuvo que pasarse varias horas frente al televisor, estudiando el hablar y los gestos del presidente de la URSS.

Por ahora no se sabe si la compañía norteamericana "Gimble Production" presentará su película en los cines soviéticos. Sólo existe el acuerdo de estrenarla en la ciudad de Kurchátov, donde se efectuó parte del rodaje, por el cual los norteamericanos pagaron 900.000 dólares. Tampoco se sabe si Mijaíl Gorbachov asistirá al estreno.

**Dmitri SIDOROV**

**Redactor de la página: K. SHELESTÓVICH**

## ШЛЯХ НАПЕРАД АСВЕТЛЕНЫ ЗОРКАЙ СКАРЫНЫ

# ПРАРОК У СВАЁЙ АЙЧЫНЕ



Халаднаваты восеньскі ранак. Калона аўтобусаў з гасцямі і ўдзельнікамі ўрачыстасцей, прысвечаных 500-годдзю Скарыны, імкліва набірае хуткасць. Наш шлях ляжыць на Полацк, на радзіму першадрукара. Мільгаюць за вокнамі жывапісныя і да болю дарагія пейзажы гэтага краю: лясы, пагоркі, курганы, старыя вясковыя могілкі з драўлянымі крыжамі, сялянскія пабудовы з невялікімі агародчыкамі. Гісторыя сведчыць, што Беларусь у мінулым была краінай замкаў і палацаў. Цяпер няма ні таго, ні другога. Беларусь... Такая знаёмая і такая загадкавая. Ты ўзгадавала генія, якога шануе ўвесь славянскі свет, усё чалавецтва. Ты спазнала веліч і прыніжэнне. А сёння нам паслана яшчэ адно выпрабаванне — Чарнобыль. Які лёс чакае цябе, мой народзе? Ці здолееш ты выжыць, залячыць нанесеныя раны, узняць высока галаву, адрадзіцца? Пытанні, пытанні, пытанні. Трывога на душы. І хваляванне. І радасць ад блізкай сустрэчы з радзімай Скарыны.

...Полацк ужо віруе. На цэнтральнай плошчы, перад гасцініцай,— цэлы парк аўтамашын. Пад'язджаюць новыя. Такога, бадай, тут не бывала даўным-даўно.

У прэс-цэнтры журналістам уручылі запрашэнні на ўсе мерапрыемствы, што адбудуцца тут з нагоды свята (а іх добры дзесятак!), сувеніры, значкі. Сярод іншага — набор паштовак канца XIX — пачатку XX стагоддзяў, якія даюць уяўленне пра тагачасны горад: велічныя саборы, старыя вуліцы, чыгуначны вакзал, рынак, пераправа цераз Заходнюю Дзвіну. Таго няма, што раней было. Зніклі з зямлі полацкай унікальныя помнікі архітэктуры, жылыя дамы і вуліцы. Ужо пры Савецкай уладзе зруйнаваны бясцэнныя скарбы. Засталося нямногае — мізэрныя рэшткі матэрыяльнай культуры магутнага і вялікага Полацкага княства, таго Полацка, у якім рос Скарына, таго Полацка, які нахтніў юнака спазнаць свет і праславіць родны горад. Але іду на спатканне з сучасным Полацкам. Хачу застацца сам-насам з гэтым дзіўным месцам, з гэтымі вулачкамі, дзе блукае рэха слаўнай мінуўшчыны, дзе жыве дух вальнадумства і асветніцтва. Недзе тут пяць вякоў назад убачыў свет сын купца Лукі Скарыны — Францыск. Відаць, хлопчык бегаў купаўца ў Палату, на беразе якой зараз стаю. Гэтаксама, як і пяць вякоў назад, узыходзіла і заходзіла сонца. Гэтаксама ўвосень падала лісце з дрэў. Гэтаксама, як і цяпер, жылі тут людзі, якія ўмелі гандляваць, будаваць, вырошчваць хлеб, спяваць песні. Што мы ведаем пра іх? Што засталося ад іх? Хіба што песні ды легенды. Затое ярка свеціцца зорка таго, хто меў ахвоту да пазнання свету і пазнання навук. Францыск Скарына, доктар навук вызваленых і лекарскіх з слаўнага горада Полацка, прынёс роднай Беларусі і ўсяму ўсходняму славянству першую друкаваную кнігу на мове свайго народа і прызначыў яе «людем посполитым». Менш як пяць гадоў займаўся Скарына непасрэдна друкаваннем кніг. Але за гэты час ён здолеў выдаць у Празе і Вільні больш за 20 адмыслова аздобленых шэдэўраў кнігадрукавання. Атрымаўшы выдатную адукацыю далёка ад радзімы, ён да канца сваіх дзён застаўся верным яе сынам, усё сваё жыццё прысвяціў пашырэнню асветы і гуманістычных ідэй сярод сваіх землякоў.

Сотні мастацкіх твораў і навуковых даследаванняў прысвечаны нашаму Скарыне. Мы ведаем, што вучонаму з сусветным імем даваліся пайсці на пасаду садоўніка чэшскага караля і гэтак зарабляць на жыццё сабе і сваім дзецям; пабываць у даўгавой турме. На жаль, адукацыя і ў той час далёка не заўсёды давала магчымасць бязбедна жыць. Дзеля ажыццяўлення сваёй мары Скарына ахвяраваў спакойным і забяспечаным жыццём чалавека з двума вучонымі тытуламі доктара навук, не пабаяўся беднасці і іншых нягод, ступаючы на шлях асветніцкай і навуковай дзейнасці.

Нездарма беларускі народ гэтак урачыста адзначае дзень нараджэння свайго славутага земляка, хаця і не самыя лёгкія часы цяпер перажывае. Нездарма яго позіркі скіраваны да Скарыны, да яго духоўнай спадчыны. У ёй ён шукае адказы на самыя балючыя пытанні сучаснага жыцця. А жыццё гэта складанае, супярэчлівае, будучыня шмат у чым залежыць ад тых маральных арыенціраў, па якіх будзе развівацца грамадства.



Але час далучыцца да агульнага свята. Суцэльны паток людзей рушыць па плошчы імя Скарыны і прылягаючых вуліцах. Тут шмат людзей у нацыянальных строях — гэта прафесійныя і самадзейныя артысты, што прыехалі сюды з усіх рэгіёнаў Беларусі і з-за яе межаў. (Шкада, аднак, што ў краме пакуль што нельга набыць нацыянальны строй, у якім так зручна прыняць удзел у вясёлым народным гулянні або ў скоках. Прадпрымальны чалавек даўно зрабіў бы на гэтым бізнес).

Групы людзей з бел-чырвона-белымі нацыянальнымі сцягамі, як і людзі з плакатамі, што вырашылі ў гэты дзень прадэманстраваць усім свае палітычныя погляды і перакананні, прыцягваюць усеагульную ўвагу. На іх насцярожана пазірае міліцыя, у іх бяруць інтэрв'ю журналісты. А ўздоўж берага ў гандлёвых радах расклалі свае вырабы народныя майстры. На памяць аб свяце можна набыць вырабы з дрэва, саломкі, гліны, а таксама кнігі. Набліжаецца ўрачысты момант—адкрыццё музея кнігадрукавання. Ён размясціўся ў будынку былой брацкай школы. Рэстаўрацыя зроблена ў даволі кароткі тэрмін. Прынамсі, спецыялістам-рэстаўратарам добраахвотна дапамаглі жыхары Полацка і Наваполацка, студэнцкая моладзь. І цяпер ля ўваход цэлы натоўп жадаючых хутчэй трапіць у музей. Праўда, у такой спешцы мала што ў тым музеі ўбачыш. Хаця сабраны ў ім экспанаты бясцэнныя, унікальныя, у тым ліку і скарынінскія выданні. Але адкрыццё ёсць адкрыццё. З незвычайнай хуткасцю ўзбуджаныя палачане і госці пераносяцца па новаму музею, каб паспець трапіць на канцэрт духоўнай музыкі ў Сафійскі сабор.

Пагаварыць з кім-небудзь у гэтым віры падзей — даволі складаная справа. Тым большым шчасцем і падарункам лёсу аказалася гутарка з нашчадкам Францыска Скарыны, доктарам медыцынскіх і філасофскіх навук з Канады Стэнлі Скарынам. Як і яго славуты продак, Стэнлі Скарына — высокаадукаваны чалавек, адметны спецыяліст у сваёй галіне. На маё пытанне, ці такой ён уяўляў Беларусь, госць адмоўна заківаў галавой. І з акцэнтам, павольна, па-беларуску стаў тлумачыць:

— Многа ведаў, многа... Чытаў. Але не думаў, што такі таленавіты беларускі народ, такі мужны. Я думаю, што за ім вялікая будучыня.

— А ці маеце сувязі са згуртаваннямі беларусаў у Канадзе? Ці чытаеце «Голас Радзімы»?

— Так. У нас многа эмігранцкіх згуртаванняў, клубаў. Таронта, Квебек. Але я не чытаю па-беларуску, на жаль. Загаварыў толькі тут. У нас ёсць музей Скарыны, многа каштоўных экспанатаў. Прыязджайце, убачыце. Напішаце.

Каб яшчэ крыху часу, я абавязкова папыталася б у Стэнлі Скарыны пра яго славутага продка, пра генеалагічнае дрэва іх роду, пра сямейныя рэліквіі і пра шмат што іншае. Але вакол нас сабраўся ўжо натоўп жадаючых сфатаграфавацца разам з ганаровым госцем. І я мусіла падпарадкавацца абставінам.

Апошні дзень свята ў Полацку найбольш запамінальны. Выразна бачацца і прыгадваюцца ўсе дэталі святочнай літургіі ў Спаса-Ефрасіннеўскай царкве.



Ідзе дробны калючы дождж, які змыў пыл з зеляніны, асвяжыў паветра, але ўшчэнт сапсаваў усе падыходы да Спаса-Ефрасіннеўскай і да Крыжаўзвіжанскай цэркваў. Не дапамог нават лінолеум, які паклалі з храмаў да сцяжынкі. Пад нагамі хлюпае. Але госці цярпліва зносяць капрызы надвор'я. У тым ліку і мае ўчарашнія знаёмыя — англічане Джым Дзінглі і Гай дэ Пікарда.

Джым Дзінглі — прафесар Лонданскага універсітэта, старшыня Англа-беларускага таварыства. Разам з прафесарам Гомельскага універсітэта Уладзімірам Анічэнкам яны рыхтуюць падручнік беларускай мовы для жыхароў англамоўных краін. Прафесар Дзінглі — класічны англічанін па абліччы, джэнтльмен па павودзінах і... зацяты беларус па духу.

Асабістая цікавасць прафесара да Беларусі прадыктавана яго навуковымі інтарэсамі. Бо ён славіст. Гадоў 15—20 назад заняўся беларусістыкай. Дарэчы, не без уплыву беларускай эміграцыі.

...Мы ходзім з прафесарам пад даждж ом па неўладкаванаму дворыку Спаса-Ефрасіннеўскай царквы. За ёю — даліна, неймавернай прыгажосці краявіды. Джым Дзінглі разгублена паціскае плячыма. «Не разумею, не разумею. Каб такое месца ўпарадкаваць, пабудаваць тут гасцініцу, сюды рушыў бы паток турыстаў». Так, і я не разумею такой безгаспадарчасці, і мне, па праўдзе, сорамна перад гасцямі за такі вось стан унікальнага помніка славянскай культуры.

Пацікавілася ў доктара Дзінглі, якое яго ўражанне ад скарынаўскага свята.

— Грандыёзна. Можа, нават залішне грандыёзна. Але гэтыя дні, праведзеныя ў Беларусі, і тут, у Полацку, далі мне магчымасць лепш зразумець сітуацыю ў Беларусі. Яна складаная. З аднаго боку — яўны ўздым нацыянальнай свядомасці, рух народа за адраджэнне. З другога — Чарнобыль. Трагедыя. Маюцца нявырашаныя эканамічныя праблемы, культурныя. Таму людзі не ведаюць, што рабіць у першую чаргу. Хлеб або мова? Я не ведаю таксама. Але ў любым выпадку, каб ствараць сапраўды шчаслівае жыццё, кожны чалавек павінен ведаць, хто ён і адкуль паходзіць, шанаваць сваю мову, звычаі і традыцыі.

Гай дэ Пікарда, даведаўшыся, што я працую ў «Голасе Радзімы», зацікавіўся, паціснуў працягнутую руку.

— Я юрыст, фальклярыст. Працую ў Лондане. Сам спяваў у царкоўным хоры, кіраваў хорам,—прадставіўся ён.—А вам мушу сказаць. што газету «Голас Радзімы» цяпер у Лондане чытаюць. Яна ўжо не тая, што была раней. Вітаем такія змены. Хацелася б, каб акрамя народных песень вы друкавалі духоўныя песнапенні, увогуле царкоўную музыку, канты... Чаму, прынамсі, служба сёння ідзе па-расейску? Хіба нельга па-беларуску?

Мы ўвайшлі з Гаем дэ Пікарда ў адчыненыя дзверы Крыжаўзвіжанскай царквы, дзе ішла літургія. Ён паставіў на падлогу дыпламат і ціхенька стаў падпяваць царкоўнаму хору.

Паміж тутэйшых бабулек, дзядоў і іншай паважнай публікі, а таксама і гасцей безупынна сноўдала мясцовая дзятва — ім было цікава ўсё, што тут адбывалася. Як маўклівы цень, застыла побач юная прыгожая манашка. Нейкі фатограф, назіраючы за ёю збоку, рэзка пстрыкнуў затворам. Дзяўчына здрыганулася і перайшла да сцяны, адвярнуўшыся ад усіх. Так да канца службы і прастаяла, нерухомая, пакорлівая, толькі галава яе нізка схілялася ў паклоне.

Адышло, адшумела свята, якое дало нам, беларусам, магчымасць пагледзець на сябе збоку і зазірнуць у сваю душу. Шмат з дасягнутага папярэднімі пакаленнямі беззваротна страчана. Многае давядзецца пачынаць з нуля. Але мы не жабракі. Не ў цемры. Шлях наперад асветлены зоркай Скарыны.

**Таццяна АНТОНАВА.**

**Здымкі на 1-й і 6-й старонках зроблены фотакарэспандэнтам С. КРЫЦКІМ у час скарынінскага свята ў Полацку.**

## ГРАВЮРЫ АРСЕНІЯ ЗАЙЦА





Выпадковая сустрэча ў музеі дапамагла ўстанавіць раней невядомага аўтара гравюр, а гісторыя культуры Беларусі папоўнілася яшчэ адным імем. Гэтыя гравюры ўжо доўгі час захоўваюцца ў фондах Пінскага краязнаўчага музея. Але ініцыялы аўтара, пастаўленыя на працах, не паддаваліся расшыфроўцы. Аднойчы ў музей прыйшла пажылая жанчына, якая жыве цяпер на Браншчыне. У размове высветлілася, што яна — былая пінчанка, пляменніца аўтара гравюр Арсенія Зайца. Расказала і яго гісторыю.

Нарадзіўся А. Заяц у 1900 годзе ў сям'і чыгуначных служачых, вучыўся ў Пінскім рэальным вучылішчы, Навазыбкаве. Белапольская акупацыя Пінска прымусіла яго завербавацца на працу ў Францыю. Доўгія гады разлукі з радзімай, праца маляром, затым дызайнерам... У трыццатыя гады Арсеній Феадосьевіч прыязджае на пабыўку ў Пінск. Менавіта да гэтага часу і адносяцца яго гравюры з відамі роднага горада. Цяпер А. Заяц жыве ў ЗША. Вядома, Арсенія Зайца прафесійным мастаком не назавеш, але тое, што ён зрабіў, дастойна павагі. Гравюры яго данеслі да нас уяўленні аб многіх архітэктурных ансамблях старажытнага палескага горада.

Я. КАЗЮЛЯ.

НА ЗДЫМКАХ: загадчыца аддзела Пінскага краязнаўчага музея Рыта МАРГОЛІНА і малодшы навуковы супрацоўнік Эдуард ЗЛОБІН разбіраюць работы, што паступілі ў музей; гравюра А. ЗАЙЦА.

## ЖЫЦЦЁ І ЛЁС СПЕВАКА МІКАЛАЯ ВОРВУЛЕВА

# НЯЗГАСНАЯ ПЕСНЯ

Заканчэнне. Пачатак у №№ 35—37.

Масквічы пачулі тады «Нёман», напэўна, упершыню. Дружна пляскаюць у далоні, з усіх бакоў чуваць воклічы адабрэння і просьба паўтарыць. У канцэрце — вялікая паўза, бо зала не сціхае. З-за кулісаў падаюць спеваку знак, дазвол на «біс». Праспяваў яшчэ, і зноў — авацыя. Зноў не адпускаюць яго са сцэны, няспынна скандзіруюць. Ён кланяецца, ідзе за кулісы. Там чакаюць сваёй чаргі на выхад калегі. У кожнага свой ашчадна выкраены сцэнічны час. Ворвулеў разумее гэта. А публіка ўсё не сціхае. Да рампы падышоў чарговы выканаўца. Яго яўна ігнаруюць, бо яшчэ мацней скандзіруюць Ворвулеву. За кулісамі чакаюць канца авацыі, а яна ўсё нарастае. Спявак мусіць ісці на сцэну.

На трэці дзень пасля дэкады ў газетах публікуецца Указ Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР аб узнагароджанні Мікалая Ворвулева ордэнам Леніна. Неўзабаве яго запрашаюць у Варшаву для ўдзелу ў месячніку савецкай культуры. Выступае там у канцэрце і ў оперы «Яўгеній Анегін». Польскія газеты друкуюць пра яго поўныя захаплення артыкулы і рэцэнзіі.

Зноў і зноў едзе Ворвулеў у замежнае турнэ. Ён, прадстаўнік Савецкай краіны, унутрана сабраны, засяроджаны і горды. Яго дзівосны голас гучыць у Бухарэсце, Сафіі, Берліне, Дрэздэне, Магдэбургу, Лондане, Манчэстэры, Шэфілдзе. Вяртаецца дамоў і раз'язджае па рэспубліцы, не мінаючы самых далёкіх раёнаў. Спадарожнікі, эстрадныя артысты, прывычаеныя да вечных пераездаў і нязручнага дарожнага жыцця, здзіўляліся яго спартанскай вынослівасці.

Як бы ні быў ён стомлены, ніколі не спяваў абы-як, а цалкам аддаваўся слухачам.

МІНАЛІ ДНІ. Некаторым таленавітым, але з празмернымі прэтэнзіямі салістам оперы стала не па сілах творча спаборнічаць з М. Ворвулевым. Ад зайздрасці пачалі яны яго трэціраваць. Аднойчы ён моцна пакрыўдзіўся на некага ў тэатры, распаліўся, а ў гэты час яму прыслалі ўжо трэцяе запрашэнне на працу ў Кіеў. Не думаючы, падаў заяву на звальненне і канчаткова парваў з родным тэатрам. Ад'язджаў яшчэ не астылы, з дзіўным і неўласцівым яму апломбам.

Стаў салістам Кіеўскай оперы. Выступіў некалькі разоў па радыё і тэлебачанні. Пракацілася пра яго слава па ўсёй краіне. Яму радасна было нанава адчуваць першае, самае моцнае ўражанне слухачоў. Пасля спектакля ці канцэрта чакалі яго паклоннікі каля службовага ўвахода ў тэатр, і калі з'яўляўся — абсыпалі кветкамі самога і дарогу, па якой ішоў да машыны.

У тыя дні Ворвулеў атрымліваў безліч лістоў і тэлеграм. Яго запрашалі ў розныя гарады. Ездзіў, збіраў аншлагі ў Харкаве, Луганску, Адэсе, Львове, Днепрапятроўску, Запарожжы, Мелітопалі. Бываў і ў іншых гарадах краіны, у прыватнасці, у Ленінградзе, дзе, як і ўсюды, меў велізарны поспех.

Увосень 1963 года я быў у Кіеве. Аднойчы, ідучы міма опернага тэатра, я дведаўся, што закончылася прадстаўленне оперы «Дэман». Мільганула думка: Мікалай яшчэ не паспеў разгрыміравацца і пайсці, значыць, знайду яго за кулісамі. Увайшоў у так званы акцёрскі пад'езд. Дзяжурная прапанавала пачакаць каля яе. Ворвулеў быў яшчэ на сцэне.

— Дык вы з Мінска? Мікалай Дзмітрыевіч узрадуецца! — вахцёрка сказала гэта і, крыху памаўчаўшы, дадала: — Ведаеце, сумуе ён па Беларусі. Спачатку быў вясёлы, а цяпер не. Яго палюбілі ў Кіеве, а ён, здаецца, не рады. Раскайваецца. Кажа, зрабіў памылку... Нашы яму па-ўкраінску, а ён у адказ па-беларуску! Вось так і размаўляе. У канцэртах спявае вашы песні. Былі з Мінска пісьменнікі. Выступіў для іх з радасцю. Прыязджаў да нас ваш славуты хор Генадзя Цітовіча. Выступалі ў калоннай зале філармоніі. Прысутнічаў Ворвулеў. Таварыш Цітовіч заўважыў яго і павітаўся са сцэны моўчкі, ківаннем галавы, а праз некалькі нумароў выйшаў на авансцэну і звярнуўся да публікі:

— Дарагія кіяўляне! У шостым радзе сядзіць Мікалай Ворвулеў — наш і ваш любімы спявак, мой даўні найшчырэйшы сябар. Бачыце, як ён разгубіўся ад увагі. Давайце папросім яго на сцэну для выканання песні пра Нёман...

Спяваў Мікалай Дзмітрыевіч з незвычайным натхненнем і, па ўласнаму прызнанню, «так, як ніколі да таго». Воплескам, здавалася, не будзе канца...

Убачыўшы мяне, Ворвулеў здзівіўся, абняў, пасадзіў насупраць. У яго грыміровачнай на падлозе, на століках і падаконніках стаялі карзіны з кветкамі.

— Уяві, — сказаў ён, — кветкі ў мяне не вянуць. Усё нясуць і нясуць. Дадому нясуць. Так што заўжды свежыя... Прызнаюся па-сяброўску: не радуе мяне поспех. Не адчуваю сябе дома. Быццам знаходжуся на гастролях, якім няма завяршэння... Слухай, пагавары ў Мінску. Магу прылятаць. Хопіць часу і ў оперы, і ў канцэрце спець. Спачатку так, разумееш, а пасля і цалкам працей вярнуцца.

У Мінску на Ворвулева крыўдзіліся, але ён цярпліва чакаў і нарэшце наладзіў кантакт. Яго запрасілі для выступленняў у оперы і ў філармоніі.

Ён здзіўлены хадзіў па беларускай сталіцы. Выраслі новыя дамы, на колішніх пустках узніклі цэлыя раёны. Горад абудзіў у ім радасць, і артыст вечарамі спяваў перад мінчанамі страсна, з поўнай душэўнай аддачай. А перад ад'ездам прызнаўся, што ад'язджае нейкі прасветлены, нібы зваліўшы з сябе цяжкі камень.

І зноў — канцэртная зала. Прыйшла паслухаць і жонка Ворвулева Любоў Герасімаўна — суровы суддзя і крытык. Яе асабліва цікавілі новыя творы мінскіх кампазітараў, падрыхтаваныя спеваком за апошні час. Голас гучаў чароўна, толькі жонцы здалося, што Мікалай Дзмітрыевіч залішне напружаны і на твары з'явілася бледнасць.

Абвясцілі антракт. Ён зацягваўся. Яна зірнула на гадзіннік, схамянулася і стрымгалоў кінулася за кулісы. Муж ляжаў на канапе. Каля яго быў доктар. Супакоіў, што нічога страшнага, што яму ўжо лепей, няхай адпачне яшчэ крыху.

Назаўтра самаадчуванне Ворвулева стала добрым, і ён забыў пра дактароў. І толькі праз некаторы час, калі ледзь не страціў прытомнасць ад болю, зноў мусіў паказацца медыкам.

Дыягназ ад яго ўтаілі. А Любові Герасімаўне сказалі: «Спадзяванняў на ратунак няма».

Неяк наладзілі канцэрт. Людзей сабралася вельмі многа. Яблыку не было дзе ўпасці. І кветкі. Кветкі ва ўсіх. Калі артыст выйшаў на сцэну, яго не адразу пазналі. Так рэзка змяніўся.

Засумаваўшы па сцэне і слухачах, Ворвулеў спяваў з вялікім запалам. Яму апладзіравалі са слязамі на вачах. Ён заўважыў гэта. Выйшаў за кулісы, запытаўся ў жонкі:

— Любачка, чаго яны плачуць?

Любоў Герасімаўна таксама не змагла стрымаць слёз.

Ён усё зразумеў. Стаяў нерухома, а потым прымусіў сябе ўсміхнуцца, абняў жонку, стаў расціраць ёй рукі.

Паклікалі на выхад. Ён мігам перамяніўся. Намаганнем волі вярнуў сабе творчае самаадчуванне і, нібыта нават вясёлы, энергічна пайшоў да агнёў рампы.

Гэта быў апошні ў яго жыцці канцэрт.

29 жніўня 1967 года Мікалая Ворвулева не стала.

Аляксей СЛЕСАРЭНКА.

## З НОВЫХ ВЕРШАЎ

**Віктар ШНІП**

*Слова «кахаю» — то слабае слова.*
*Мужнае слова — абараняю.*
Ларыса ГЕНІЮШ.

***

Колькі прызнанняў у шчырым каханні,
Цяжка паверыць у шчырасць прамоў.
Покуль гаворым, руйнуе курганні
Той, хто адрокся сваіх каранёў.

Покуль гаворым, руйнуюцца замкі,
Песні ў нябыт адыходзяць з людзьмі.
Частка гаворкі — выгодныя лямкі, —
Раз ухапіўся — цягні ды цягні.

Сёння, як смецце, — прызнанні, прамовы,
Імі не спыніш віхуры, агню...
Слова «кахаю» — то слабае слова,
Мужнае слова — абараню.

***

і прыйшоў Ён і сказаў Ён
ратуйце сябе і сваіх дзяцей
дзяцей дзяцей дзяцей
і кінуліся людзі да сваіх куфэркаў
да куфэркаў да куфэркаў да куфэркаў
а куфэркі пустыя пустыя пустыя
і кінуліся людзі да панчох з грашыма
а яны пустыя пустыя пустыя
і кінуліся хапаць што трапіць у рукі
што трапіць у рукі што трапіць у рукі
і што ні схопяць з рук выпадае
выпадае выпадае выпадае
і прыйшоў Ён і сказаў Ён
супакойцеся супакойцеся супакойцеся
і яны распялі яго яшчэ раз
яшчэ раз яшчэ раз яшчэ раз.
яшчэ многа многа многа разоў
і не плакалі дзеці

**Ала КАЖЭРА**

***

Ах, мае сваякі-беларусы.
Я дарэмна патраціла час,
Не ўтрымаўшыся ад спакусы
Абудзіць голас продкаў у вас.

У мяккім змроку маскоўскай кватэркі
Мой парыў вам зусім не знаём,
Весяліла вас слова «цукеркі»,
Называлі вы Мінск «гарадком».

Пэўна, лепшую стрэнулі долю,
Без патрэбы тут бабчын абрус.
...Успамінамі больш не зняволю,
Мне пара на экспрэс «Беларусь».

***

Не заснуць ні ўноч, ні ранкам,
Нібы з кратаў рвецца кроў,
Чарнавокаю цыганкай
Разгулялася любоў.

Ёй бы зноў шатры ды поле
З перапевамі вятроў,
Песень вольнае раздолле
Каля полымя кастроў.

Ліхадзействам ці падманам
Зноў цябе прываражыць
Ды з гітарай закаханай
Вочы сінія любіць.

***

Чую песні маладосці мамы,
Ажылі, як казачныя сны,
Гукі меладычнай светлай гамы,
Што гучалі ў песнях да вайны.

Ручайкамі чыстымі ўліліся
У грукоту і шуму вадаспад.
Прыпыніся, друг мой, азірніся,
Шчэ жыве наш старадаўні сад.

І стаіць у садзе тым альтанка —
Не змяніла вобліку амаль,
У глыбі каханка-паланянка
Твар хавае ў карунковы шаль.

## *У ВАШУ КАЛЕКЦЫЮ*





Філатэлістычная Скарыніяна папоўнілася новымі паштовымі выпускамі. Напярэдадні святкавання 500-годдзя першадрукара пошта выпусціла мастацкі канверт з вядомым рысункам мастака А. Кашкурэвіча, які прадстаўляе партрэт беларускага асветніка. На канверце надпіс на беларускай і рускай мовах «Францыск Скарына. Да 500-годдзя з дня нараджэння». У дзень святкавання юбілею на Мінскім паштамце адбылося гашэнне карэспандэнцыі штэмпелем, у малюнку якога так званы герб Скарыны — Месяц і Сонца. Гэты знак можна знайсці на ўсіх пражскіх і віленскіх кнігах першадрукара. На штэмпелі дадзены юбілейны тэкст «Францыск Скарына. Да 500-годдзя з дня нараджэння. Мінск. Паштамт. 05.09.1990.»

Да юбілею выдадзена таксама паштовая картка з адлюстраваннем часткі вядомай гравюры 1517 года, дзе паказаны Ф. Скарына, які сядзіць перад рукапісам. Копію для паштовай карткі з гравюры зрабіў мастак А. Фралоў. У малюнку карткі герб Скарыны і надпіс: «Францыск Скарына. Да 500-годдзя з дня нараджэння». Варта адзначыць, што ў 1988 годзе пошта нашай краіны выдала паштовую марку, прысвечаную першадрукару, паштовы канверт і спецыяльны штэмпель. А ў 1967 годзе да 450-годдзя беларускага кнігадрукавання быў выдадзены канверт з адлюстраваннем гравюры 1517 года.

**Леў КОЛАСАЎ.**

**КАЛІ ВЫ ЗНАХОДЗІЦЕСЯ ДАЛЁКА АД МЯСЦІН, ДЗЕ ПАХАВАНЫ ВАШЫ СВАЯКІ, ВЫТВОРЧЫ ЦЭНТР**

***«МІЛАСЭРНАСЦЬ»***

**ЗАБЯСПЕЧЫЦЬ ПАСТАЯННЫ ДОГЛЯД МАГІЛ ВАШЫХ БЛІЗКІХ У ЛЮБЫМ МЕСЦЫ ПАХАВАННЯЎ НА ТЭРЫТОРЫІ БЕЛАРУСІ.**

**МЫ ГАРАНТУЕМ ВЫКАНАННЕ НАСТУПНЫХ ПАСЛУГ:**

**— ПОШУК І РЭСТАЎРАЦЫЯ (АДНАЎЛЕННЕ) МАГІЛ,**

**— ВЫСАДЖВАННЕ КВЕТАК, ДЭКАРАТЫЎНЫХ КУСТОЎ І ДРЭЎ,**

**— РАМОНТ І АДНАЎЛЕННЕ НАДМАГІЛЬНЫХ ПОМНІКАЎ І АГАРОДЖАЎ,**

**— ЗАКАЗ ПАНІХІДЫ,**

**— ВЫРАБ І ЎСТАНОЎКА ПОМНІКА І АГАРОДЖЫ, ЯКІЯ МОГУЦЬ БЫЦЬ ЗРОБЛЕНЫ ПА ВАШАМУ ПРАЕКТУ ЦІ ПА НАШЫХ УЗОРАХ,**

**— ІНШЫЯ ВІДЫ ПАСЛУГ, ЯКІЯ ЗВЯЗАНЫ З РЫТУАЛЬНЫМ АБСЛУГОЎВАННЕМ.**

**Аб нашай рабоце вы можаце меркаваць па фотаматэрыялах, якія будуць рэгулярна высылацца вам. Пры асабістым наведванні магіл цэнтр забяспечыць вас жыллём і транспартам.**

**Калі вас зацікавілі нашы прапановы і вы жадаеце атрымаць дадатковую інфармацыю, звяртайцеся на адрас:**

**220030, г. Мінск, вул. Чырвонаармейская, 30. Аддзел сацыяльнай дапамогі і рытуальных паслуг вытворчага цэнтра інвалідаў вайны, працы і дзяцінства «МІЛАСЭРНАСЦЬ».**

**Тэлефон 29-37-03.**

**Тэлефакс (0172) 69-09-54.**

## *СПОРТ*

Нават таварыскія сустрэчы па хакею паміж савецкімі клубамі і камандамі НХЛ выклікаюць большую цікавасць, чым некаторыя чэмпіянаты свету. Далёка за прыкладам хадзіць не трэба. У гэтыя дні робяць турнэ па СССР хакеісты «Мінесота Норд Старз» і «Манрэаль Канадзіенс». Іх гульні з савецкімі спартсменамі праходзяць пры вялікай колькасці балельшчыкаў. А ўсе газеты не шкадуюць сваіх старонак для асвятлення гэтых матчаў.

Шкада, што каманды НХЛ не будуць гуляць у Мінску. Але беларускія аматары спорту могуць ганарыцца. Некалькі нашых выхаванцаў выступаюць за савецкія клубы. Так, самым актыўным іграком у матчы маскоўскі «Спартак» — «Мінесота Норд Старз» быў Баршчэўскі, які ў высакакласнага хакеіста вырас у Мінску. Дарэчы, разам з ім у гэтым матчы ўдзельнічаў яго зямляк Шыпіцын. А калі гаварыць пра саму гульню, то перамог «Спартак» — 8:5. Цяпер будзем чакаць, як каманда НХЛ выступіць супраць маскоўскага «Дынама», дзе гуляюць яшчэ некалькі хакеістаў з Беларусі.

Падобная карціна і ў футболе. Пачаліся адборачныя матчы алімпійскіх турніраў, а таксама — першынства Еўропы. Як вядома, каманда СССР няўдала выступіла сёлета на першынстве свету. Таму зборная краіны створана нанава, змяніўся і галоўны трэнер. Ім стаў Анатоль Бышавец. Ён не ўключыў у склад новай каманды «пастаянных» членаў зборнай мінскіх дынамаўцаў Алейнікава і Зыгмантовіча на першы матч з нарвежцамі. Затое добра зарэкамендаваў сябе ў гэтай сустрэчы былы ігрок беларускага сталічнага клуба Гарлуковіч. Ён стаў адным з лепшых абаронцаў каманды СССР, якая перамагла нарвежцаў з лікам 2:0.

Ну а калі гаварыць пра першынствы свету, Еўропы і міжнародныя турніры, то тут беларускія спартсмены аказаліся на вышыні. Мінчанка Ляпезіна стала чэмпіёнкай свету па парашутнаму спорту ў Бялградзе.

Чакалі мы поспеху і беларускай спартсменкі Амяльянчык на чэмпіянаце Еўропы па водных лыжах. І Марына парадавала нас: выйграла залаты медаль у фігурным катанні. Спаборніцтвы прайшлі ў Францыі

## *НАШЫ ВЫТОКІ*

# МЛЫНАР ДЗЕД МАРТЫН



**Рачулка Івязянка ля вёскі з такой жа назвай замаруджвае свой бег і, перагароджаная плацінай, разліваецца невялікім азярцом. На яе беразе ўзвышаецца на каменным фундаменце стары млын. Крыху ўбаку — дом млынара Мартына Плюто.**

**Дзед Мартын, як завуць яго ўсе ў акрузе, хоць і размяняў ужо дзевяты дзесятак гадоў, яшчэ не толькі сваю гаспадарку даглядае, але млын і ўсе яго механізмы трымае ў поўным парадку. Так ужо павялося: у Дзятлаўскім раёне млыноў да нядаўняга часу быў не адзін дзесятак. Адрамантаваць, падрэгуляваць механізмы — тут ужо без Мартына Мартынавіча было не абысціся.**

**З гадамі такіх невялікіх калгасных млыноў паменела, ды і здароўе ўжо не дазваляла ездзіць па раёну. А тут свой пад бокам, стары, яшчэ ў 1927 годзе пабудаваны, але працаваць можна. І вось ужо пятнаццаць гадоў камандуе тут дзед Мартын. Малоў зерне калгасу «Меляховічы» — не злічыць, колькі яго прайшло праз жорны. А апошнія гады меле зерне для аднавяскоўцаў...**



**Прыбраны з палёў ураджай. Абмалацілі снапы на сялянскіх падворках. І вось-вось пацягнуцца павозкі з зернем да старога млына дзеда Мартына. Зашуміць на коле вада, набяруць хуткасць цяжкія жорны, і пальецца лёгкім мяккім струменьчыкам свежая жытняя мука. Хлеб з яе асабліва смачны.**

**НА ЗДЫМКАХ: млын ля вёскі Івязянка Дзятлаўскага раёна; млынар Мартын ПЛЮТО.**

**Фота Я. КАЗЮЛІ.**

## ДРАЎЛЯНЫ ВЕРНІСАЖ

Калі нехта зняверыўся, што на свеце існуюць чараўнікі, то дарэмна. Інакш, як казачным, той свет, што ствараюць работы рэзчыка па дрэву Ігара Лізуры, выстаўленыя ў павільёне Дома прыроды ў Мінску, не назавеш.

Мастак ужо доўгія гады жыве ў Ніжнім Тагіле, а вось работы яго напоўнены нейкай асаблівай цеплынёй і любоўю да сваёй малой радзімы, землякоў. Яны надзіва трапна перадаюць беларускі нацыянальны каларыт, гумар і настрой нашага народа. І, напэўна, не адзін жыхар Старых Дарог (там нарадзіўся мастак) пазнае ў маленькіх драўляных скульптурах сябе ці сваіх знаёмых.

Усё пачалося з таго, што калісьці яго дзед, майстар-рэзчык, паказаў унуку, як трэба абыходзіцца з дрэвам. Ён быў першым, хто падказаў хлопчыку, што можна зрабіць з дубу, а што з буку і ліпы. І самае галоўнае яго завяшчанне: работа, зробленая без душы, не прынясе радасці ні майстру, ні людзям.

## ПАКАЗВАЮЦЬ ЗБІРАЛЬНІКІ

Вынікі даўгалетняй працы падзвіжнікаў-калекцыянераў часта можна па вартасці ацаніць, толькі пабываўшы ў іх хатніх галерэях. Яны, зразумела, — не лепшае месца для шырокай публікі.

Магчымасць сябе паказаць і другіх паглядзець была прадастаўлена ўладальнікам цікавых калекцый 8 верасня. У гэты дзень на ВДНГ БССР адкрылася іх выстаўка, над арганізацыяй якой працавалі Міністэрствы культуры і асветы рэспублікі, Белсаўпроф, а таксама зацікаўленыя грамадскія аб'яднанні. Мэта яе — азнаямленне са светам збіральніцтва, стракатай палітрай аматарскай творчасці і народных промыслаў.

Аўкцыёны на ёй дапамогуць зрабіць свае першыя набыткі тым, каго захопяць, напрыклад, экзатычныя ракавінкі ці старадаўнія манеты, а масцітым — ацаніць сілы канкурэнтаў.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ

**НАШ АДРАС:**

**МІНСК-5, ЛЕНІНСКІ ПРАСПЕКТ, 44.**

**ТЭЛЕФОНЫ: 33-01-97, 33-02-80, 33-03-15, 33-16-56, 33-07-82.**

Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КП Беларусі.

Індэкс 63854. Зак. № 1219